Источник: "Настаўніцкая газета" - 2021-02-25

# Вучоны шматграннага таленту

## *(Да 130-годдзя прафесара М.М.Піятуховіча)*

***Сярод беларускіх літаратуразнаўцаў першай паловы XX стагоддзя адным з самых таленавітых і арыгінальных быў прафесар дэкан педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Міхаіл Мікалаевіч Піятуховіч.***

Беларускі гісторык і літаратуразнавец Генадзь Кісялёў вызначае М.М.Піятуховіча як “беларускага крытыка і літаратуразнаўца” (Беларуская энцыклапедыя. Т.12. Мн., 2001. С.398), а літаратуразнавец І.Э.Багдановіч называе яго “літаратуразнаўцам, крытыкам, педагогам” (Беларускія пісьменнікі. Біябібліяграфічны слоўнік. Т.5. Мн., 1995. С.29). Калі ацэньваць навуковую спадчыну Міхаіла Піятуховіча аб’ектыўна і ўсебакова, то да гэтых вызначэнняў Г.В.Кісялёва і І.Э.Багдановіч трэба дадаць, што М.М.Піятуховіч быў яшчэ таленавітым фалькларыстам, публіцыстам і архівістам.

Яго малая радзіма — вёска Алексінічы Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. Тут 23 лютага 1891 года ў сям’і вясковага праваслаўнага святара пачаўся жыццёвы шлях Міхася Піятуховіча. Ён атрымаў сярэднюю адукацыю ў Магілёўскай духоўнай семінарыі. У 1917 годзе скончыў Нежынскі гісторыка-філалагічны інстытут і быў накіраваны ў Петраградскі ўніверсітэт для падрыхтоўкі да прафесарскага звання па кафедры рускай літаратуры і славеснасці. Матэрыяльныя цяжкасці прымусілі ўнесці карэктывы ў жыццёвыя планы. У пачатку 1920 года М.Піятуховіч пераехаў жыць у Адэсу да сваякоў жонкі. Ён уладкаваўся на пасаду інструктара аддзела народнай адукацыі, а затым працаваў на іншых адміністрацыйна-педагагічных пасадах.

У канцы 1920 — пачатку 1921 года ў Савецкай Беларусі былі прыняты меры па разгортванні культурна-адраджэнскіх працэсаў. Але гэтая праца ўскладнялася недахопам настаўнікаў школ, выкладчыкаў навучальных устаноў, культурна-асветных работнікаў. Менавіта таму ЦВК Беларусі ў лютым 1921 года звярнуўся з заклікам да раскіданых вайной культурных работнікаў вярнуцца на Радзіму. У 1921 годзе толькі з Адэсы вярнуліся такія выдатныя дзеячы беларускай культуры, як будучы старшыня Інстытута беларускай культуры Сцяпан Некрашэвіч, будучы дацэнт кафедры геалогіі БДУ таленавіты беларускі вучоны і паэт Міхаіл Грамыка, будучы арыгінальны літаратуразнавец, дэкан педфака БДУ, акадэмік, прафесар Міхась Піятуховіч.

У верасні 1921 года Міхаіл Мікалаевіч быў абраны членам Навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамата асветы БССР (ССРБ), стаў выкладчыкам і сакратаром Белпедтэхнікума. З лютага 1922 года быў навуковым супрацоўнікам, а з 1925 года — правадзейным членам Інстытута беларускай культуры. Беларуская даследчыца І.Э.Багдановіч адзначае, што з 1929 да 1936 года М.М.Піятуховіч з’яўляўся правадзейным членам АН БССР (Багдановіч І.Э. Піятуховіч Міхайла // Беларускія пісьменнікі. Біябібліяграфічны слоўнік. Мн., 1995. С.29). Ён праявіў сябе не толькі таленавітым навукоўцам, але і аўтарытэтным педагогам. Справа ў тым, што Міхаіл Мікалаевіч у 1921—1926 гадах выкладаў беларускую літаратуру ў Беларускім педагагічным тэхнікуме, а ў 1925—1926 навучальным годзе быў там намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце.

З лютага 1922 года М.М.Піятуховіч працаваў у Беларускім дзяржаўным універсітэце — спачатку выкладчыкам і дацэнтам кафедры заходнееўрапейскай і беларускай літаратур, а з кастрычніка 1926 года — прафесарам кафедры беларускай літаратуры. У маі (па іншых даных, у чэрвені. — ***Э.І.***) 1926 года ён быў абраны дэканам аднаго з самых прэстыжных факультэтаў БДУ — педагагічнага. У кнізе “Беларускі дзяржаўны універсітэт. 1921—1927” была змешчана “Старонка ўспамінаў” прафесара БДУ М.М.Піятуховіча, якая знаёміць чытача са станоўішчам спраў і вучэбным працэсам ва ўніверсітэце ў 1922—1927 гадах. І па гэты дзень, калі калектыў БДУ рыхтуецца адзначыць 100-годдзе, успаміны захоўваюць сваю каштоўнасць. Пачынаючы з 1925 года педфак БДУ стаў выпускаць студэнтаў, якія павінны былі пачаць працу ў розных школах Беларусі. На многіх універсітэцкіх нарадах адзначалі актыўнасць і добрыя вынікі работы дэканата педфака і асабіста дэкана М.М.Піятуховіча.

З імем М.М.Піятуховіча звязаны станаўленне і поспехі ў дзейнасці Інстытута беларускай культуры. Пра гэта сведчаць фонды Цэнтральнага навуковага архіва (ЦНА) НАН Беларусі і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Так, напрыклад, у пратаколе № 4 агульнага сходу членаў Інстытута беларускай культуры ад 30 сакавіка 1925 года адзначаецца, што М.Піятуховіч быў абраны намеснікам старшыні літаратурнай секцыі Інбелкульта (ЦНА НАНБ. Ф.67. Воп.1. Спр.12. Л.9—10. Арыгінал). 20 мая 1925 года на пасяджэнні прэзідыума Інстытута беларускай культуры ён быў уключаны ў склад камісіі ІБК па святкаванні 20-гадовага юбілею літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы (Тамсама. Спр.9. Л.130. Арыгінал.). Не трэба забываць, што менавіта ў 1925 годзе М.М.Піятуховіч быў абраны правадзейным членам Інбелкульта, а праз чатыры гады — у 1929-м — правадзейным членам АН БССР, дзе працаваў на кафедры гісторыі беларускай літаратуры і ў Інстытуце літаратуры і мастацтваў.



У пачатку 1930-х гадоў над прафесарам М.Піятуховічам навісла пагроза рэпрэсій з-за яго “непралетарскага паходжання”. Нягледзячы на тое што, у рэшце рэшт, Прэзідыум АН БССР у 1933 годзе атэставаў М.Піятуховіча як “праверанага вучонага-спецыяліста”, ён у 1934 годзе вырашыў пакінуць тэрыторыю БССР. Міхаіл Мікалаевіч выехаў у горад Арджанікідзэ, дзе працаваў выкладчыкам-славістам у Паўночна-Каўказскім і Паўночна-Асецінскім педагагічных інстытутах.

У 1934—1936 гадах, працуючы на Паўночным Каўказе, Міхаіл Мікалаевіч працягваў друкавацца ў выданнях роднай Беларусі. Першы артыкул 30-гадовага М.Піятуховіча “Прырода ў творчасці Я.Коласа” быў апублікаваны ў 1921 годзе ў выданні “Вольны сцяг” (№ 6). Менавіта з гэтага часу ён выступаў у рэспубліканскім друку як літаратурны крытык і арыгінальны даследчык беларускай літаратуры. Да сённяшняга дня не страцілі навуковай каштоўнасці артыкулы М.Піятуховіча пра фальклор, Ф.Скарыну, Ф.Багушэвіча, Я.Купалу, Я.Коласа, М.Багдановіча, З.Бядулю, П.Труса, Ц.Гартнага, Ядвігіна Ш., М.Чарота, К.Чорнага, М.Лынькова.

Нельга не згадзіцца з думкай беларускага гісторыка і літаратуразнаўца Г.В.Кісялёва пра тое, што ўніверсітэцкі курс прафесара М.Піятуховіча лёг у аснову першай часткі яго “Нарысаў гісторыі беларускае літаратуры (Агляду літаратурна-ідэалагічных плыняў XIX і пачатку XX ст.)” (Мн., 1928), якія мелі станоўчае значэнне ў тагачасных метадалагічных пошуках. Акрамя гэтага, значны ўклад у беларускае літаратуразнаўства ўнеслі артыкулы “Апавяданне “У палескай глушы” як новы этап беларускай мастацкай прозы” (Мн., 1927), “Асноўныя этапы беларускай літаратуры” (Мн., 1927), “Звычаі і песні беларускага селяніна ў іх гаспадарчай аснове” (Мн., 1928), “Асноўныя этапы ў развіцці беларускай літаратуры паслякастрычніцкага перыяду” (Мн.,1933), “Беларускі фальклор” (Мн., 1936). Міхаіл Мікалаевіч быў рэдактарам-укладальнікам першай гістарычна-літаратурнай хрэстаматыі “Выпісы з беларускай літаратуры: новы і найноўшы кругабегі” (1923), рэдактарам, аўтарам уступнага артыкула да твораў П.Труса (1934, 1935). Амаль усе беларускія літаратуразнаўцы высока ацэнваюць працу М.Піятуховіча “Рукапісы А.Рыпінскага”, апублікаваную выдатным беларускім даследчыкам В.Скалабанам праз 53 гады пасля смерці яе аўтара — у 1990 годзе.

Ад’езд М.Піятуховіча на Паўночны Каўказ не ўратаваў яго. Праз 20 гадоў, 27 снежня 1957 года, М.М.Піятуховіч быў пасмяротна рэабілітаваны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Імя вучонага шматграннага таленту, арыгінальнага літаратуразнаўца і літаратурнага крытыка, педагога і фалькларыста Міхася Піятуховіча яшчэ чакае свайго ўвекавечання на Радзіме.

**Эмануіл ІОФЕ,**
**прафесар,**
**доктар гістарычных навук.**

Эмануіл Іофе. Вучоны шматграннага таленту